КРАЕВЕДЧЕСКИЙ КЕЙС СОЛИГОРСКА

# ПЕРШАЯ ЧАРГА САЛІГОРСКАГА КАМБІНАТА Ў СТРАІ

**Дарагія таварышы!**

**Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР горача віншуюць слаўны калектыў будаўнікоў, мантажнікаў, гарнякоў і хімікаў 1-га Салігорскага калійнага камбіната з вялікай працоўнай перамогай — датэрміновым уводам у дзеянне першай чаргі калійнага камбіната.**

**Увод у дзеянне буйнога прадпрыемства, якое выпускае мінеральныя ўгнаенні, — выдатны ўклад беларускіх будаўнікоў, мантажнікаў, гарнякоў і хімікаў у справу ўсенароднай барацьбы за паскораны ўздым сельскагаспадарчай вытворчасці. Гэта працоўная перамога — выдатны падарунак Радзіме ў гонар снежаньскага Пленума ЦК КПСС.**

**ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што гарнякі і хімікі Салігорска за кароткія тэрміны асвояць уведзеныя магутнасці, а будаўнікі і мантажнікі і ў далейшым будуць самаадданa працаваць над далейшым нарошчваннем магутнасцей хімічнай прамысловасці.**

**Жадаем вам, дарагія таварышы, вялікіх працоўных поспехаў.**

| ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КПСС | САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР |
|---|---|